Канстанцін БАНДАРЭНКА

# Перыядычныя выданні праваманархічных арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX стагоддзя

*Пачатак XX стагоддзя стаў часам узнікнення значнай колькасці перыядычных выданняў розных палітычных кірункаў. На старонках газет і часопісаў правага кірунку прапагандаваліся ідэі вернасці самадзяржаўнай уладзе.*

У гады першай расійскай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі сталі актыўна ўзнікаць аддзелы і пададдзелы праваманархічных партый. Найбольшая іх колькасць была створана арганізацыяй "Союз Русского Народа" (СРН). Акрамя яго на тэрыторыі Беларусі ў 1905—1907 гг. дзейнічалі "Северо-Западное Русское Вече", Віленскі аддзел "Русского Собрания" і таварыства "Крестьянин", а таксама арганізаваны ў кастрычніку 1906 г. "Русский Окраинный Союз". Пасля расколу ў 1907—1911 гг. "Союза Русского Народа" ўтварыліся тры самастойныя партыі — "Русский Народный Союз имени Михаила Архангела", "Союз Русского Народа — обновленческий" і "Всероссийский Дубровинский Союз Русского Народа". Побач з імі ў беларускіх губернях напярэдадні і ў час Першай сусветнай вайны былі прадстаўленыя сваімі аддзеламі "Всероссийский Национальный союз", "Русское Окраинное Общество", "Отечественный патриотический союз". Найважнейшым напрамкам іх практычнай дзейнасці з'яўлялася агітацыйна-прапагандысцкая і культурна-асветніцкая работа сярод насельніцтва.

Адным са сродкаў правядзення гэтай работы была арганізацыя ўласнай выдавецкай дзейнасці. Паводле даных газет "Московские ведомости" (органа "Русской монархической партии") і "Русское знамя" (галоўнага перыядычнага выдання "Союза Русского Народа"), у пачатку 1906 г. на тэрыторыі Расійскай Імперыі выдавалася 89 газет і часопісаў правага манархічнага кірунку[1]. Сярод найбольш папулярных і ўплывовых цэнтральных выданняў, якія мелі распаўсюджанне на тэрыторыі беларускіх губерняў, неабходна назваць газеты "Русское знамя", "Известия Русского Собрания", "Московские ведомости", "Вече", "Земщина", "Россия", "Колокол", "Окраины России", часопісы "Прямой путь", "Вестник Союза Русского Народа". У дадзеным артыкуле мы раскажам аб асноўных выданнях, якія мелі распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі.

Часцей за ўсё ў дакументах беларускіх аддзелаў і пададдзелаў агульнарасійскіх манархічных саюзаў сустракаюцца сведчанні аб пашырэнні ўплыву на беларускія тэрыторыі **газеты "Русское знамя"**. Як правіла, яны ёсць у лістах у рэдакцыю газеты або ў Галоўны савет СРН, а таксама "Всероссийского Дубровинского Союза Русского Народа" (ВДСРН) з просьбамі даслаць выпускі выдання ў аддзелы на бясплатнай аснове. Напрыклад, старшыня аддзела Нацыянальнага рускага саюза (хутчэй за ўсё "Всерос-



***БАНДАРЭНКА Канстанцін Міхайлавіч.***

*Рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1951 г. у в. Кучын Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. У 1976 г. закончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, у 1982 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова на розных пасадах — асістэнта, старшага выкладчыка, дацэнта, загадчыка кафедры. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Даследуе гісторыю палітычных партый і грамадска-палітычных рухаў Расіі і Беларусі пачатку XX ст. Аўтар больш за 100 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій, хрэстаматый, вучэбных дапаможнікаў.*

сийского национального союза". — **К.Б.**) з в. Гранічы (паштовая станцыя Краснае) Краснасельскай воласці Віленскай губерні, настаўнік Граніцкага народнага вучылішча П.Сямёнаў у лісце ў рэдакцыю газеты ў 1913 г. адзначаў, што ў аддзеле ўсе сяляне, і сяброўскія ўнёскі (20 капеек з чалавека) не пакрываюць выдаткі аддзела, а таму прасіў рэдакцыю дасылаць хоць бы адзін нумар газеты бясплатна[2]. Сустракаюцца і лісты, якія змяшчаюць інфармацыю пра стан спраў у аддзелах, пра падзеі, якія мелі месца ў павеце або канкрэтным населеным пункце. Так, у лісце ад 13 снежня 1906 г. у рэдакцыю газеты "Русское знамя", падпісаным старшынёй Быхаўскага аддзела СРН К.Жданавым і яго намеснікамі П.Андрэевым і А.Скібінскім, расказвалася пра рэвалюцыйныя падзеі ў павеце ў 1905 г. Заканчваўся расказ характэрнай для таго часу высновай: *"Население у нас на половину еврейское, а они главная почва для всякой крамолы"*[3]. 10 і 12 сакавіка 1907 г. у газеце былі змешчаныя дзве тэлеграмы з Магілёва наступнага зместу: *"Подъем громадный, записалось* (у Магілёўскі губернскі аддзел СРН. — **К.Б.**) <...> *более 300 вчера записалось еще 328"*[4].

Першы нумар газеты "Русское знамя" выйшаў 27 лістапада 1905 г. Спачатку газета выдавалася на сродкі рэдактараў, з'яўлялася штотыднёвай, раздавалася і рассылалася членам саюза бясплатна. Аднак ужо з другой паловы снежня 1905 г. яна была ператорана ў штодзённую і прадавалася па цане 2 капейкі за нумар. Сродкаў на выданне амаль заўсёды не хапала, падпіска ледзь пакрывала 25% выдаткаў, і Галоўны савет СРН не раз звяртаўся да сваіх аддзелаў за дапамогай. Яна, як правіла, аказвалася. У матэрыялах перапіскі Віцебскага губернскага аддзела ВДСРН, напрыклад, захаваўся ліст у Галоўны савет ад 3 снежня 1914 г. *"о собранных пожертвованиях в сумме 34 руб. 30 коп. по подписным листам на "Русское знамя"*[5].

У Беларусі газета "Русское знамя" знаходзіла свайго чытача ў пераважнай большасці сярод маламаёмасных слаёў насельніцтва. Гэта пацвярджаецца не толькі фактамі з перапіскі аддзелаў манархічных саюзаў і партый, якія ў беларускіх губернях складаліся ў асноўным з сялян і мяшчан, але і пісьмовымі сведчаннямі палітычных праціўнікаў СРН. Вось што пісаў, напрыклад, публіцыст меншавік В.Лявіцкі (О.Цэдэрбаўм), характарызуючы стыль і ўзровень газеты "Русское знамя": *"Его сотрудники не останавливаются перед крепким словцом, перед самым вульгарным сравнением, лишь бы поразить противника и пойти навстречу низменным вкусам своего неприхотливого читателя: мелкого лавочника, дворника или серого рабочего. Отстаивая принцип самодержавия и реакции, "Русское знамя" щеголяет перед читателем из простонародья своим демократизмом... Заигрывая с демократией, "Русское знамя" не устает бичевать бюрократию, далеко стоящую от народа и не знающую его нужд, а попутно и интеллигенцию, не понимающую народной "души" и идущую на поводу у "жидов" и иных инородцев"*[6].

Пры гэтым ён быў вымушаны прызнаць сур'ёзны ўплыў газеты сярод прыхільнікаў самадзяржаўнага ладу. *"При всем своем литературном и идейном убожестве,* — пісаў В.Лявіцкі, — *"Русское знамя" занимает влиятельное положение среди органов правой печати, будучи широко распространенным, являясь идейным вдохновителем и руководящим центром для иногородних организаций союза русского народа"*[7].

Яшчэ адным выданнем, якое карысталася папулярнасцю ў беларускіх губернях, была грамадская, палітычная і літаратурная **газета "Вече"**, якая выходзіла з 1906 г. два разы на тыдзень — у чацвер і нядзелю. Артыкулы і лісты рэдакцыя прапаноўвала дасылаць *"без иностранных слов и выражений"*, а таксама без *"сложных оборотов речи"*[8]. Па сваіх мэтах і задачах, даступнасці для насельніцтва гэтая газета знаходзілася на адным узроўні з "Русским знаменем". Падпіска на паўгоддзе каштавала 2 рублі, адзін нумар у свабодным продажы — 10 капеек[9].

У рэдакцыйным артыкуле ад 15 чэрвеня 1906 г. давалася ацэнка палітычнай сітуацыі ў краіне і адначасова крытыкавалася патуранне з боку ўрада ў адносінах да "ганенняў" рэвалюцыянераў на СРН і правую прэсу. *"Целый год,* — адзначалася ў артыкуле, — *в России убивают, калечат и ранят городовых, офицеров, губернаторов, околоточных надзирателей, полицмейстеров и казаков. А правительство ...все это терпит и терпит... Революционеры деятельно готовят вооруженное восстание в самом Петербурге... а чтобы отнять у Союза Русского Народа возможность мешать революционерам, на всех фабриках и заводах в Петербурге сразу, точно по мановению какого-то тайного руководителя, началось гонение на членов Союза Русского Народа и одновременно с этим в газетах началась травля против руководителей Союза. Правительство на водворение порядка жалеет денег. А революционеры сыпят сотнями тысяч... А правительство богатейшего в мире Монарха жалеет денег на газеты и на пропаганду среди рабочих и крестьян здравых понятий"*[10]. У гэтым пратэсце рэдакцыі было па сутнасці выкладзена палітычнае крэда адной з найбольш папулярных у асяроддзі прыхільнікаў манархічнай ідэі газеты.

Сярод выданняў правага кірунку, якія карысталіся папулярнасцю ў беларускіх манархістаў, варта асабліва вылучыць перыёдыку "Русского Народного Союза имени Михаила Архангела" (СМА), і ў першую чаргу палітычны, эканамічны і літаратурны **часопіс "Прямой путь"**. Першапачаткова часопіс выдаваўся у перыяды думскіх сесій, як правіла, па пятніцах, і быў адносна недарагім, а таму даступным для чытачоў. Экзэмпляр выдання каштаваў усяго 8 капеек, а падпісная цана на год складала 3 рублі[11]. Першы нумар выйшаў 1 мая 1909 г., у ім рэдакцыя наступным чынам вызначыла мэты і задачы выдання: *"Одна из главных задач газеты, к изданию которой мы приступаем, — давать своим читателям возможно полное и правильное освещение широких, общих во-*

*просов нашей внутренней политики и общественной жизни. Так как эти вопросы наиболее ярко преломляются в Государственной Думе, то ея деятельность будет для нас предметом особого внимания. "Прямой Путь" не является в полном смысле слова органом какой-либо политической партии или Думской ея фракции, но мы находим нужным заявить с самого начала, вполне определенно, наши симпатии всецело принадлежат "правым" членам Государственной Думы"*[12]. Далей, адзначаючы неабходнасць існавання прадстаўнічых заканадаўчых устаноў, аўтары артыкула звярталі ўвагу на недасканаласць выбарчага закона, які дае перавагу палякам на выбарах у Дзяржаўную Думу і Дзяржаўны Савет у Паўночна-Заходнім краі, і прапаноўвалі змяніць яго на карысць рускага насельніцтва. Зрабіць гэта, на іх думку, абавязаная была існуючая (г. зн. самадзяржаўная) улада, якая *"...должна быть сильной, решительной и, прежде всего, национальной. Такую власть <...> мы будем поддерживать всеми своими силами"*[13]. Гэтыя ідэалагічныя ўстаноўкі сталі свайго роду праграмай выдавецкай дзейнасці часопіса "Прямой путь" — галоўнага друкаванага органа адной з самых аўтарытэтных агульнарасійскіх праваманархічных партый.

Са студзеня 1913 г. часопіс "Прямой путь" выходзіў у Санкт-Пецярбургу ў друкарні таварыства "Свет" у выглядзе кніг, як штомесячныя выпускі. У ім былі наступныя раздзелы: 1) бягучае палітычнае жыццё Расіі і пытанні міжнароднай палітыкі; 2) пытанні царкоўныя, грамадскія і народнай гаспадаркі; 3) жыццё рускай школы; 4) дзейнасць Дзяржаўнага Савета і Дзяржаўнай Думы; 5) палітычны агляд; 6) унутраны агляд; 7) абласны аддзел; 8) дзейнасць "Русского Народного Союза имени Михаила Архангела" і іншых манархічных саюзаў; 9) белетрыстыка і крытыка; 10) агляд часопісаў і кніг; 11) навука і мастацтва. Восьмы раздзел выходзіў пад назвай "Манархічнае жыццё" і змяшчаў інфармацыю аб дзейнасці Галоўнай палаты СМА, яго аддзелаў і іншых манархічных арганізацый[14]. У кожным выпуску часопіса публікаваліся матэрыялы аддзелаў і пададдзелаў саюза з беларускіх губерняў.

Цікавыя звесткі аб цесных сувязях беларускіх манархістаў з галоўным друкаваным органам СМА утрымліваюцца ў лістах і артыкулах, дасланых у яго рэдакцыю для наступнага апублікавання. Часта ў гэтых дакументах сустракаюцца звароты члена-паборніка "Русского Окраинного Союза", інжынера па прафесіі Людвіга Фаміча Івіцкага (літаратурны псеўданім Эльфі) у рэдакцыю, а таксама на адрас У.М.Пурышкевіча (старшыні СМА, члена Дзяржаўнай Думы) з запытам пра ганарары за артыкулы, напісаныя для часопіса, просьбамі аказаць грашовую дапамогу на лячэнне, а таксама адказы на гэтыя лісты[15]. Ёсць і даныя аб падпісцы на часопіс "Прямой путь" па Віленскай губерні. Так, сярод 27 чалавек, якія падпісаліся на 1914 год, былі віленскі губернатар П.Вяроўкін, яго чыноўнік па асобых даручэннях стацкі саветнік А.Пешкаў, справавод губернскага праўлення У.Мярвіцкі і 18 служачых віленскай паліцыі — ад прystава да паліцмайстара ўключна[16]. У спісе значацца таксама падпісчыкі з г. Дзісна і м. Паставы таго ж павета[17]. Акрамя гэтага, прамую фінансавую падтрымку часопісу аказвалі беларускія манархісты[18]. У дакументах перапіскі захоўваюцца шматлікія лісты на імя старшыні СМА, якія сведчаць аб разнастайнасці тэматыкі перапіскі, пастаноўцы праблем і шырокай геаграфіі сувязяў кіраўніцтва партыі і рэдакцыі часопіса "Прямой путь" з карэспандэнтамі з Беларусі[19]. У прыватнасці, ёсць ліст члена Лоеўскага Савета СРН, настаўніка Ручаёўскага народнага вучылішча Карпа Аляксандравіча Шашко, у якім паведамлялася: *"евреи раздают революционные газеты, а православной патриотической печати нет"*, і выказвалася просьба даслаць правыя газеты і адкрыць аддзел Саюза на станцыі Ручаёўка[20].

У манархічных арганізацыях беларускіх губерняў, асабліва ў перыяд крызісу СРН (1909—1911 гг.), распаўсюджвалася і выданне СРН-абнаўленчага **газета "Земщина"**, першы нумар якой выйшаў 3 ліпеня 1909 г. Спачатку яна рассылалася ў аддзелы бясплатна, але з 1 студзеня 1911 г. рэдакцыя вымушана была ўвесці плату за выданне, абмежаваўшыся зніжэннем для мясцовых арганізацый "абнаўленцаў" на штогадовую падпіску ў памеры 1 рубля[21].

Імкнучыся пашырыць і ўмацаваць свой уплыў на грамадскую свядомасць, Галоўны Савет СРН-абнаўленчага прыняў у 1910 г. рашэнне аб выданні, акрамя газеты, штотыднёвага царкоўна-народнага, палітычнага, эканамічнага, грамадска-літаратурнага **часопіса "Вестник Союза Русского Народа"**. Падпісная цана на год складала ўсяго 1 рубель, на месяц — 10 капеек, а адзін экземпляр каштаваў 3 капейкі, што рабіла часопіс адным з самых танных выданняў правых сілаў[22]. Першы нумар часопіса выйшаў 13 чэрвеня 1910 г. У ім было надрукавана "Архипастырское приветствие Вестнику Союза Русского Народа" члена Дзяржаўнай Думы і ганаровага члена "Союза Русского Народа" епіскапа гомельскага Мітрафана, у якім фактычна раскрывалася прызначэнне новага друкаванага органа правых сілаў. *"В наши дни,* — адзначалася ў ім, — *когда печать приобрела такое громадное влияние на умы и настроение людей и когда она в подавляющем большинстве враждебно относится к церкви православной, имеет большое значение появление органа печати, ставящего своею прямою целью защиту веры и церкви от всяких посягательств на их целость и нерушимость, откуда бы они не исходили. Среди общаго стремления робких и боязливых душ разрешать самые коренные вопросы путем компромиссов и уступок, голос твердый и независимый, без страха и боязни срывающий покров со всякого лицемерия и выше всего ставящий благо народа и церкви, явится подобно набату призывного колокола будящего уснувшия совести. Нет сомнения, что таковым и будет новый орган союза русского народа, как живое отражение тех дум, того настроения, какими проникнут православный, верующий народ. Пусть же он разносит по всей святой Руси призыв к благостному миру, честно-*

*му труду и беззаветной верности тем коренным основам, на которых зиждется мощь России. Слово гнило да не исходит из уст ваших. Ничего легкомысленного, ничего злобного не должно появляться на страницах нового органа, но только слово предочищенное и одухотворенное, слово правды и любви должно изливаться оттуда благодатной струей, разнося отраду и умиротворение в сердцах русских людей"*[23].

Працытаваныя настаўленні аднаго з самых аўтарытэтных праваслаўных святароў Паўночна-Заходняга краю, арганізатара і натхняльніка Магілёўскага Саюза рускіх людзей сталі свайго роду лейтматывам усяго існавання праваманархічнага часопіса. На яго старонках змяшчалася самая розная інфармацыя аб дзейнасці СРН-абнаўленчага і іншых правых партый як у цэнтры Расійскай Імперыі, так і на яе ўскраінах. Можна казаць, што публікацыі часопіса аказвалі ўплыў не толькі на яго чытачоў, але таксама і на прадстаўнікоў улады, нават самаго імператара Мікалая II. Так, напрыклад, 25 чэрвеня 1910 г. у № 3 часопіса было змешчана "Воззвание Могилевского Губернского Отдела Союза Русского Народа" наступнага зместу: *"Откликнитесь, дорогие союзники, и помогите, кто чем может, всякая лепта будет принята с большой благодарностью"*[24]. Справа заключалася ў тым, што ноччу 6 чэрвеня 1910 г. у Магілёве на Маскоўскім прадмесці (цяпер Лупалава. — **К.Б.**) здарыўся пажар, у якім згарэла 466 двароў, з іх каля 300 дамоў членаў і прыхільнікаў СРН. Пасля гэтага быў створаны Саюзны камітэт па зборы ахвяраванняў пагарэльцам, які ўзначаліў ганаровы старшыня губернскага аддзела СРН епіскап Гомельскі Мітрафан. Заклік аб дапамозе друкаваўся ў дзевяці наступных нумарах часопіса, што спрыяла актывізацыі дапамогі пацярпелым. 9 ліпеня 1910 г. на старонках № 5 выдання з'явілася наступнае паведамленне: *"Государь Император 14 июня Высочайше повелеть соизволил выдать из 10 млн. фонда, предназначенного на непредусмотренные сметами расходы, двадцать пять тысяч рублей в пособие погорельцам гор. Могилева"*[25]. Акрамя таго, паводле імператарскага ўказу, з пажарнага капіталу Міністэрства ўнутраных спраў было дадаткова выдзелена 10 тыс. руб. і дазволены агульнаімперскі збор ахвяраванняў на карысць пагарэльцаў.

Звесткі аб стварэнні, унутрыпартыйным жыцці (пытаннях, якія выносяцца на разгляд агульных сходаў, пасяджэнняў саветаў аддзелаў і пададдзелаў, іх справаздачы ў Галоўны савет СРН і інш.), практычнай дзейнасці мясцовых падраздзяленняў СРН-абнаўленчага асвятляліся ў раздзелах "Хроніка аддзелаў і пададдзелаў СРН" або "Дзейнасць аддзелаў СРН". Значная частка гэтых матэрыялаў тычылася беларускіх утварэнняў СРН-абнаўленчага[26].

Значнай папулярнасцю карысталася ў беларускіх манархістаў **газета "Окраины России"**. Першапачаткова планавалася выдаваць яе ад імя "Русского Собрания", аднак у лісце да А.І.Дубровіна ад 11 студзеня 1906 г. старшыня Ускраінскага аддзела "Русского Собрания" генерал-лейтэнант А.М.Залатароў паведаміў, што старшыня асобай нарады "Русского Собрания" па выданні газеты "Окраины России" сенатар М.Д.Сергяеўскі *"уведомил <...> о возникновении между Совещанием и Советом недоразумения, тормозящего дело издания"*[27]. Гаворка ішла аб адсутнасці ў Савета "Русского Собрания" неабходных грашовых сродкаў. З-за гэтага газета стала выдавацца "ўдзельнікамі-ахвярадаўцамі", пры пасрэдніцтве штогод абіраемага імі рэдакцыйнага камітэта[28].

Першы нумар газеты "Окраины России" выйшаў у сакавіку 1906 г. Неўзабаве кіраўнікі рэдакцыйнага камітэта выступілі з ініцыятывай стварыць арганізацыю, якая магла б "удыхнуць жыццё" ў распачатую справу і ўзначаліла б на ўскраінах рух сілаў у падтрымку афіцыйнай манархічнай дактрыны. Такой арганізацыяй стала "Русское Окраинное Общество", статут якога быў афіцыйна зарэгістраваны 18 сакавіка 1908 г.[29]. З гэтага часу газета "Окраины России" стала яго афіцыйным друкаваным органам. На старонках газеты, як правіла, змяшчаліся навіны з Вільні, Віцебска, Гродна, Магілёва, Мінска і іншых гарадоў Беларусі, давалася хроніка падзей, публікаваліся аналітычныя матэрыялы рэдактараў газеты і кіраўнікоў "Русского Окраинного Общества" — А.Будзіловіча, А.Залатарова, М.Сергяеўскага, П.Бывалькевіча, выдаўца П.Кулакоўскага і інш. Апошні нумар газеты "Окраины России" выйшаў у канцы 1912 г. У ім П.Бывалькевіч і П.Кулакоўскі, падводзячы вынікі сямігадовай дзейнасці газеты, прыйшлі да высновы, што *"окраинные вопросы стали центральными в деятельности всех политических лагерей в Думе и вне Думы. Национальными проблемами окраин интересуется печать различных политических направлений, а посему насущной необходимости в такой газете, как "Окраины России", больше не существует"*[30].

Дастаткова шырока правая перыёдыка была прадстаўленая ў Беларусі таксама наступнымі мясцовымі газетамі і часопісамі: "Виленский вестник", "Белая Русь", "Морская волна", "Белорусская жизнь", "Северо-Западная жизнь", "Виленские губернские ведомости", "Минское русское слово", "Минское слово", "Белорусский голос", "Минская русская газета", "Витебский вестник", "Витебские губернские ведомости", "Гомельский вестник", "Могилевский вестник", "Гродненские губернские ведомости", "Оршанский вестник", "Крестьянин" і інш.[31]. Усяго на тэрыторыі Беларусі ў 1905—1917 гг. налічвалася каля 30 найменняў перыёдыкі (але адначасова яны ніколі не існавалі), на старонках якіх знаходзіла адлюстраванне або з'яўлялася асноўнай манархічная тэматыка[32].

Сярод вельмі правых мясцовых выданняў неабходна перш за ўсё вылучыць орган Віленскага губернскага аддзела "Союза Русского Народа" **газету "Морская волна"**, якая выдавалася з 31 сакавіка 1907 г. па 29 мая 1910 г. Першапачаткова меркавалася, што яна будзе выходзіць штотыднёва, аднак ужо з восені 1907 г. "Морская волна" выходзіла адзін-

два разы на месяц, а то і радзей. Усяго быў выдадзены 51 нумар. Рэдактарам-выдаўцом газеты нязменна заставаўся А.Шміт, які прадаставіў пад рэдакцыю і кантору сваю ўласную кватэру[33].

"Морская волна" была, бадай, адзіным беларускім выданнем, якое адкрыта называла сябе "чарнасоценным" і прапаведавала праваманархічную ідэалогію. На першай старонцы кожнага нумара друкаваўся верш, які адлюстроўваў палітычнае крэда газеты:

*Кто молитву творя*
*Чтит народ и царя,*
*В ком ни сердце, ни ум не шатаются,*
*Кто под градом клевет*
*Русь спасает от бед,*
*Черносотенцем тот называется*[34].

Падобныя ідэі знайшлі адлюстраванне і ў перадавым артыкуле праграмнага характару, змешчаным у першым нумары выдання. Галоўнай мэтай сваёй дзейнасці газета абвяшчала наступнае: *"Служить Вере Православной, Царю Самодержцу Всероссийскому и Великому Народу Русскому, униженному и оскорбленному инородцами и иноверцами окраин"*[35]. У цэлым "Морская волна" характарызавалася сучаснікамі і сёння ацэньваецца даследчыкамі як вельмі правае выданне з таго шэрагу афіцыйных органаў і газет кірунку "Союза Русского Народа", якія ўзніклі ў правінцыі[36]. Нароўні з газетамі "Русское знамя" і "Вече" палітычны орган віленскіх манархістаў "Морская волна" шырока распаўсюджваўся актывістамі ВДСРН пры адкрыцці імі аддзелаў і пададдзелаў у паветах і валасцях беларускіх губерняў[37].

Заслугоўвае ўвагі даследчыкаў і штодзённая грамадска-палітычная **газета** манархічнага кірунку **"Северо-Западная жизнь"**, якая выходзіла з 10 жніўня 1911 г. па 5 верасня 1915 г. спачатку ў Вільні, з 21 сакавіка 1912 г. у Гродна, а з сакавіка 1913 г. у Мінску[38]. Рэдагаваў газету яе выдавец Л.Саланевіч, у розны час яму дапамагалі брат С.Саланевіч і сын І.Саланевіч. Газета працягвала палітычную праграму сваёй папярэдніцы — газеты "Белорусская жизнь" (выдавалася ў студзені — жніўні 1911 г.). Сутнасць гэтай праграмы сцісла вызначалася наступным чынам: *"Основная наша задача — служить интересам русского населения Северо-Западного края, интересам русской культуры, русского прогресса, призывая массы местного русского населения, а особенно местной русской интеллигенции к борьбе за свои национально-культурные и государственные идеалы"*[39].

Губернскія аддзелы правых партый часта выкарыстоўвалі для прапаганды сваіх поглядаў, публікацыі праграмных дакументаў, заклікаў і проста для размяшчэння інфармацыйных матэрыялаў афіцыйныя органы губернскіх праўленняў, **газеты "Губернские ведомости"**, якія выдаваліся на казённы кошт з рознай перыядычнасцю ў залежнасці ад губерні. "Губернскія ведамасці" складаліся з афіцыйнай і неафіцыйнай частак, кожная з якіх мела значэнне самастойнага выдання. У першай друкаваліся пастановы, распараджэнні, аб'явы, паведамленні цэнтральных і мясцовых улад, а ў другой, як правіла, змяшчаліся грамадска-палітычныя матэрыялы[40].

Цэнтрам яднання мясцовых актывістаў "Дубровинского Союза Русского Народа" з 1 ліпеня 1912 г. і да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. выступала штодзённая грамадска-палітычная **газета** праваканерватыўнага кірунку **"Витебский вестник"**, якая выдавалася за дзяржаўныя грошы. Газета друкавала афіцыйныя ўрадавыя матэрыялы, хроніку, агляды публікацый цэнтральных газет і часопісаў, паведамленні з жыцця манархічных арганізацый, партый і саюзаў. Беларускія губерні рэдакцыя газеты лічыла спрадвечна рускім краем, адзначаючы ў сваіх публікацыях толькі некаторыя іх мясцовыя асаблівасці, і ставіла ў якасці асноўнай задачы абарону самадзяржаўя і праваслаўнай веры ў Паўночна-Заходнім "рускім" краі[41].

Шмат у чым падобныя пазіцыі сярод іншых беларускіх перыядычных выданняў займалі "Виленский вестник", "Минское слово", "Минские ведомости", "Могилевский вестник", якія па сваёй ідэалагічнай накіраванасці, падборы і падачы інфармацыйных матэрыялаў былі праваднікамі дзяржаўнай палітыкі, абаронцамі праваслаўных і самадзяржаўных асноваў, прыярытэтнага становішча ў краі рускага насельніцтва[42].

Нельга не сказаць аб адзіным у сваім родзе грамадска-палітычным і сельскагаспадарчым **часопісе "Крестьянин"**, органе праваманархічнага беларускага таварыства з такой жа назвай. Часопіс выдаваўся ў Вільні з 1906 па 1915 гг. штотыднёва, часта на дзяржаўныя субсідыі. Палітычнае крэда "Крестьянина" было выкладзена ўжо ў першым нумары ў звароце "К нашим читателям крестьянам", а затым канкрэтызавана ў выбарчай платформе аднайменнага таварыства да выбараў у І Дзяржаўную думу. Рэдакцыя заклікала ўмацоўваць у краі асновы самадзяржаўя, падтрымлівала сталыпінскую аграрную рэформу, вяла пастаянную палеміку з газетай "Наша Ніва", крытыкуючы апошнюю за прапаганду беларускай нацыянальнай ідэі і права беларусаў звацца асобным этнасам[43].

Абаронцамі праваслаўнай веры, неабмежаванага самадзяржаўя, інтарэсаў рускай народнасці — ідэалагічнай трыяды праваманархічных арганізацый — выступалі **"Епархиальные ведомости"**, якія з'яўляліся органамі праваслаўных духоўных кансісторый. У Беларусі выходзілі гродзенскія, літоўскія (г. Вільня), мінскія, магілёўскія і полацкія (г. Віцебск) "Епархиальные ведомости", на старонках якіх рэгулярна публікаваліся пропаведзі епіскапаў (кіраўнікоў дыяцэзій — праваслаўных царкоўных акругаў), афіцыйныя царкоўныя дакументы і нярэдка змяшчаліся інфармацыйныя матэрыялы, якія выходзілі ад манархічных арганізацый. Як правіла, у пропаведзях царкоўнаслужыцеляў утрымліваліся заклікі да вернікаў абараняць уладу цара-самадзержца, праваслаўную веру і падтрымліваць правыя партыі і саюзы, якія выступаюць за захаванне традыцыйных для рускага народа жыццёвых асноў[44].

Падводзячы высновы, варта адзначыць, што беларускія аддзелы і пададдзелы агульнарасійскіх праваманархічных партый і мясцовыя правыя арганізацыі мелі ў пачатку XX ст. магутны сродак ідэалагічнага ўздзеяння на масы праз праўладную прэсу, а таксама ўласныя партыйныя газеты і часопісы, параўнальна недарагія, а таму даступныя для шырокіх колаў насельніцтва. Адсюль становіцца зразумелым значны ўплыў правых партый і саюзаў на грамадскае жыццё Расійскай Імперыі і яе ўскраін і, як вынік, той унёсак, які яны зрабілі ў паражэнне першай расійскай рэвалюцыі.

[1] Из истории общественно-политических движений, партий России и СССР. Материалы к спецкурсу / Б.В. Леванов [и др.]; под ред. Б.В.Леванова. Кн. 1. М., 1990. С. 54.

[2] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ). Ф. 116, воп. 1, спр. 80, арк. 78-79.

[3] Там жа. Спр. 290, арк. 1-2.

[4] Там жа. Спр. 292, арк. 1-2.

[5] Там жа. Спр. 84, арк. 100.

[6] Левицкий В. Правые партии // Общественное движение в России в начале XX в.: в 5 т. / под ред. Л.Мартова [и др.]. Т. 3, кн. 5. СПб., 1914. С. 398.

[7] Там жа. С. 399.

[8] ДАРФ. Ф. 102, воп. 236, спр. 550, ч. 1, арк. 1.

[9] Там жа.

[10] Там жа. Арк. 1-2.

[11] Прямой путь. 1909, № 1. С. 1.

[12] Там жа.

[13] Там жа. С. 2.

[14] Монархическая жизнь // Прямой путь. 1913. Вып.1. С. 172-173.

[15] ДАРФ. Ф. 117, воп. 1, спр. 578, арк. 30—32 адв.; спр. 583, арк. 93—96, 98-99, 122, 158-159, 160-161 адв.

[16] Там жа. Спр. 594, арк. 58.

[17] Там жа.

[18] Там жа. Арк. 76; спр. 584, арк. 11 адв.

[19] Там жа. Спр. 580, арк. 10—12 адв.; спр. 583, арк. 136-137; спр. 594., арк. 21, 23—25; спр. 595, арк. 11-12; спр. 598, арк. 19-20, 35-36, 49; спр. 23, арк. 32.

[20] Там жа. Спр. 32, арк. 3-3 адв.

[21] Там жа. Ф. 116, воп. 1, спр. 80, арк. 27 адв.; Шевцов А.И. Издательская деятельность русских несоциалистических партий начала XX века. СПб., 1997. С. 173-174.

[22] Вестник Союза Русского Народа. 1910, № 1. С. 1.

[23] Митрофан, епископ. Архипастырское приветствие Вестнику Союза Русского Народа // Вестник Союза Русского Народа. 1910, № 1. С. 2.

[24] Воззвание Могилевского Губернского отдела Союза Русского Народа // Вестник Союза Русского Народа. 1910, № 3. С. 16.

[25] Высочайшая помощь погорельцам г. Могилева // Вестник Союза Русского Народа. 1910, № 5. С. 2.

[26] Вестник Союза Русского Народа. 1910, № 11. С. 10; № 17. С. 12; № 18. С. 10-11; № 24. С. 8; № 27. С. 10; № 29. С. 10-11.

[27] Шевцов А.И. Издательская деятельность русских несоциалистических партий начала XX века. С. 203.

[28] Бондаренко К.М. Русское Окраинное общество: возникновение, политические цели и задачи // Романовские чтения: сб. тр. Междунар. науч. конф., Могилев, 24 окт. 2004 г. / под ред. О.В.Дьяченко. Могилёв, 2005. С. 28.

[29] Устав Русского Окраинного Общества. СПб., 1908.

[30] Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). Мн., 1999. С. 144.

[31] Бондаренко К.М., Лавринович Д.С. Русские и белорусские монархисты в начале XX века. Могилёв, 2003. С. 132—134; Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 102, 109, 123-124; Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 — 1917 гг.): в 4 т. Т. 3. Мн., 1953. С. 305—309.

[32] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 — 1917 гг.): в 4 т. Т. 3. С. 305—309.

[33] Волженков В.В. Крайне правая пресса на территории Беларуси в нач. XX в. (на примере газеты "Морская волна") // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова. 2008, № 1. С. 19.

[34] Кто молитву творя... // Морская волна. 1917, 31 марта. С. 1.

[35] Господи, благослави наше русское независимое печатное слово! // Морская волна. 1907, 31 марта. С. 1.

[36] Шевцов А.И. Издательская деятельность русских несоциалистических партий начала XX века. С. 176.

[37] ДАРФ. Ф. 116, воп. 1, спр. 22, ч. 2, арк. 50 адв.

[38] Конан У. "Северо-Западная жизнь" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 6, кн. 1. Мн., 2001. С. 274.

[39] ДАРФ. Ф. 116, воп. 1, спр. 84, арк. 65.

[40] Мальдзіс А. "Виленские губернские ведомости" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Мн., 1994. С. 289; Будзько У., Нікалаеў М. "Витебские губернские ведомости" // Там жа. С. 306; Пушкін І. "Могилевские губернские ведомости" // Там жа. Т. 5. Мн., 1999. С. 219.

[41] Конан У. "Витебский вестник" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Мн., 1994. С. 307; Местная хроника // Витебский вестник. 1916, 29 марта. С. 3; Местная хроника // Витебский вестник. 1916, 7 мая. С. 4.

[42] Мальдзіс А. "Виленский вестник" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. С. 289; Конан У. "Минские ведомости" // Там жа. Т. 5. С. 196; Конан У. "Могилевский вестник" // Там жа. Т. 5. С. 220; Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.): в 4 т. Т. 3. С. 73, 93.

[43] Бондаренко К.М. Русские и белорусские монархисты в начале XX века. С. 78-79; Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). С. 105-106; К нашим читателям крестьянам // Крестьянин. 1906, № 1. С. 5—7; Вопросы, которые должны быть поставлены выборными от Русского населения в Государственной Думе в первую очередь обсуждения // Крестьянин. 1906, № 3. С. 37—40; Об издании журнала "Крестьянин" на 1907 г. // Крестьянин. 1906, № 46-47. С. 721-722.

[44] Слова, поучения и речи Архимандрита Митрофана, ректора Могилевской Духовной семинарии. Могилев-на-Днепре, 1906. С. 189-190; Речь преосвященнейшего Митрофана, епископа Гомельского при освящении нового помещения Главного Совета Союза русского народа // Могилевские епархиальные ведомости. 1910, № 5. С. 151-152; О Русском Окраинном Союзе. Устав Русского Окраинного Союза // Минские епархиальные ведомости. 1907, 1 февраля. С. 70—76; Епархиальная хроника // Минские епархиальные ведомости. 1908, 1 декабря. С. 785-786; К какой политической партии принадлежит православное духовенство? // Полоцкие епархиальные ведомости. 1906, 5 марта. С. 164-165; "Епархиальные ведомости" // Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. Мн., 2001. С. 104; Грыгор'ева В. "Полоцкие епархиальные ведомости" // Там жа. С. 260; Філатава А. "Гродненские епархиальные ведомости" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 3. Мн., 1996. С. 155; Салодкіна Л. "Минские епархиальные ведомости" // Там жа. Т. 5. С. 197; Грыгор'ева В. "Могилевские епархиальные ведомости" // Там жа. С. 219-220.